*Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 40 (54) Нядзеля, 2 верасня 1945 г.

## Пачаўся новы навучальны год у пачатковых школах

1 верасня школы нашага раёна шырока распахнулі дзверы для вясёлай, жыццёрадаснай совецкай дзетвары. Маладыя грамадзяне зноў занялі свае месцы за школьнымі партамі. Навучальны год у пачатковых школах пачаўся.

Сур'ёзна рыхтаваліся да гэтага дня школы раёна. Настаўнікі, уся совецкая грамадскасць многа папрацавалі над тым, каб падрыхтаваць дзетвары добры падарак—светлыя і чыстыя памяшканні, новыя парты, нарыхтаваць для школ дастатковую колькасць паліва. Добра падрыхтаваліся да новага навучальнага года Сукачская пачатковая школа, школы Галоўчыцкага сельсовета.

Аднак, у асобных школах заняткі пачынаюцца ў памяшканнях не ўпаўне прыстасаваных да нармальнага навучання. Праходзячая канферэнцыя настаўнікаў ускрыла рад недахопаў у падрыхтоўцы школ да навучальнага года ў Акцябрскай НСШ, Вулькаўскай, Каменскай пачатковых школах і другіх.

Адсюль, перад работнікамі народнай асветы, кіраўнікамі сельскіх советаў стаіць задача—хутчэй закончыць абарудаванне школьных памяшканняў, нарыхтоўку паліва і інш. Для гэтага ёсць усе магчымасці. Заняткі пачнуцца ў старэйшых класах (пачынаючы з 5—га), толькі з 1 кастрычніка і частку школьных памяшканняў можна за гэты час адрамантаваць.

З пачаткам навучальнага года неабходна асаблівую ўвагу звярнуць на ахоп усіх дзяцей школай. У гэтым вялікую дапамогу настаўнікам павінны аказаць сельскія советы. Закон аб усеагульным навучанні павінен быць выканан.

Партыя і совецкі ўрад праяўляюць выключныя клопаты аб школе, аб выхаванні маладога пакалення. На народную асвету дзяржава адпускае мільёны рублёў. Задача совецкага настаўніка прыкласці ўсе свае веды і здольнасці да таго, каб выхоўваць пакаленне смелых, мужных людзей, прывіваць ім любоў да Радзімы, працы і навукі, гатоўнасць у любую мінуту стаць на абарону сваёй соцыялістычнай Айчыны.

Цяперашні навучальны год пачаўся ў радасныя дні для совецкага народа. Гераічная Чырвоная Армія сумесна з саюзнікамі ліквідавала апошні ачаг агрэсіі на Далёкім Усходзе. Вайна закончана. Настаў радасны час мірнай працы. Сягоняшнія выхаванцы школ будуць актыўнымі ўдзельнікамі аднаўлення народнай гаспадаркі, навукі і культуры. Яны заклікаНы забяспечыць далейшы росквіт нашай совецкай краіны. Да гэтага і павінны рыхтаваць школы кожнага вучня.

### АБ ПАЧАТКУ НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА Ў ШКОЛАХ СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ

У сувязі з хадайніцтвам мясцовых совецкіх органаў Совет Народных Камісараў СССР дазволіў аблвыканкомам, крайвыканкомам, Соўнаркомам рэспублік перанесці пачатак заняткаў у 5—9 класах сярэдніх і няпоўных сярэдніх школ у сельскай мясцовасці на 1 кастрычніка 1945 года. (ТАСС).

## У ЧЭСЦЬ ПЕРАМОГІ

З вялікай радасцю сустрэлі сяляне вёскі Варатынічы, Акцябрскага сельсовета загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Генералісімуса Сталіна, прысвечаны перамозе Чырвонай Арміі на Далёкім Усходзе.

У чэсць перамогі нашых далёкаўсходніх войск сяляне ўзмацняюць тэмпы збожжанарыхтовак. Большая частка сялян гэтай вёскі, разлічыўшыся з дзяржавай па абавязковых пастаўках, здаюць збожжа ў фонд Чырвонай Арміі. Першым у вёсцы выканаў план пастаўкі збожжа інвалід працы Таргун К. К. і здаў у фонд Чырвонай Арміі 10 пудоў. Максім Дзянісюк, два сыны якога служаць у арміі, разлічыўся з дзяржавай па ўсіх відах паставак і здаў у фонд Чырвонай Арміі 8 пудоў. 175 кілограм здаў 65-гадовы Раман Ганчар, жонка воіна Артысюк Ольга—150 кілограм, маці двух чырвонаармейцаў Артысюк Параскеўя—100 кілограм і другія.

Здача збожжа ў фонд Чырвонай Арміі працягваецца.

М. Турчыцкі.

### ПРЫЁМ І. В. СТАЛІНЫМ ДЭЛЕГАЦЫІ ПРОФСАЮЗА РАБОЧЫХ АЎТАМАБІЛЬНАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ ЧЭХАСЛАВАКІІ

30 жніўня Старшыня Совета Народных Камісараў СССР Генералісімус І. В. Сталін прыняў дэлегацыю профсаюза рабочых аўтамабільнай прамысловасці Чэхаславакіі.

На прыёме прысутнічалі Народны Камісар Замежных Спраў СССР В. М. Молатаў, Павераны ў Справах Чэхаславакіі ў СССР пан Я. Гнізбо і Старшыня ВЦСПС В. В. Кузняцоў.

Дэлегацыя перадала Генералісімусу І. В. Сталіну падарунак чэхаславацкіх рабочых—аўтамашыну, выраблепую на заводах Прагі і альбом з фотаздымкамі, якія адлюстроўваюць работу на пражскіх аўтамабільных заводах.

Таварыш Сталін прасіў дэлегацыю перадаць чэхаславацкім рабочым яго ўдзячнасць.

(ТАСС.)

# Ліквідаваць адставанне сельсовета па збожжапастаўках

Няма цяпер больш пачотнейшай задачы перад кожным селянінам і сялянкай, як своечасовая выкананне першай запаведзі—здача збожжа дзяржаве.

—Чым больш дадзім мы хлеба краіне, тым хутчэй залечым раны, нанесеныя вайной,—гаворыць селянін вёскі Толкава Захар Нічыпарчук. Яго гаспадарка вызвалена ад усіх налогаў, але ён дабраахвотна здаў 218 кг. жыта ў фонд Чырвонай Арміі. Датэрмінова разлічыцца па хлебапастаўках імкнуцца і многія сяляне сельсовета. Вось напрыклад, сялянка Юрчыц Ольга, сям'я чырвонаармейца, мае пяць дзяцей, але яна першай арганізавала малацьбу і здала збожжа дзяржаве. Поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках Рубанюк Павел, Рубанюк Федар і другія.

Можна было-б прывесці яшчэ дзесяткі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, якія разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках.

Аднак, гэтае благароднае імкненне бядняцка-серадняцкіх гаспадарак быць у перадавых радах ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве па датэрміноваму выкананню хлебанарыхтовак не стала ў Першамайскім сельскім савеце ўсеагульным і сельсовет адстае па збожжапастаўках.

Асобныя заможныя гаспадаркі сталі на шлях сабатажу і не прыступілі да здачы збожжа дзяржаве. Да прыкладу можна прывесці Навасад Федора з вёскі Першамайск, які мае 7,88 га ворыўнай зямлі, а не здаў дзяржаве ніводнага кілограма. Таксама не пачалі здачу збожжа дзяржаве Несцярук Дзяніс, Несцярук Афанасій з вёскі Свеклічы. Яны маюць па 15 гектараў зямлі, свае млыны. Многія гаспадаркі не ўказалі точна колькі ў іх маецца зямлі. Напрыклад, Марушка Аляксандр з вёскі Гарыцы з 22 гектараў указаў 14 га, Несцярук Фёдар замест 12 гектараў запісаў 9 га. А ўсяго ў сельсовеце недалічанай зямлі—843 гектары.

Кіраўніцтва сельсовета (старшыня т. Мацука) добра знала гэта становішча, але не прымала належных мер.

Першамайскаму сельсовету, выканаўшаму план збожжанарыхтовак на 33,7 проценты, яго дэпутатам и сабходна неадкладна выправіць допушчаныя памылкі і арганізаваць работу так, каб сельсовет у бліжэйшыя дні вывесці з адстаючых у перадавыя.

**О. Казлоўская.**



**Збожжа—дзяржаве**

Сяляне сяла Табаны, Брычанскага раёна, Бельцкага уезда, Малдаўскай ССР, вязуць хлеб дзяржаве. Да гадавіны вызвалення Малдавіі сяляне гэтага сяла поўнасцю выканалі свае абавязацельствы па пастаўках збожжа дзяржаве.

Фото Б. Неўзорава. Фотахроніка ТАСС.

## ЗВОДКА
**аб ходзе збожжанарыхтовак па раёну на 31 жніўня.**

| №№ п/п | Назва сельсоветаў | Процант выканання |
|---|---|---|
| 1 | Дзетнавіцкі | 47,6 |
| 2 | Акцябрскі | 44,9 |
| 3 | Гарадзецкі | 41,2 |
| 4 | Галоўчыцкі | 39,4 |
| 5 | Антопальскі | 39,4 |
| 6 | Худлінскі | 39,3 |
| 7 | Аніскавіцкі | 35,4 |
| 8 | Асіпавіцкі | 35,3 |
| 9 | Першамайскі | 33,7 |
| 10 | Ілаўскі | 32,8 |
| 11 | Дзямідавіцкі | 32,1 |
| 12 | Дзераўноўскі | 27,0 |
| 13 | Камянскі | 26,7 |
| 14 | Заніўеўскі | 24,5 |

Па раёну: 35,9

## ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

У номеры ад 26 ліпеня 1945 года ў перадавой раённай газеты „Перамога": „У тэрмін і добраякасна убраць ураджай" указвалася на дрэнную работу канторы Заготзярно па падрыхтоўцы складаў да прыёму збожжа новага ураджаю.

Выканком Райсовета дэпутатаў працоўных паведаміў рэдакцыю, што факты, указаныя ў перадавой, поўнасцю падцвердзіліся. За безадказныя адносіны да падрыхтоўкі складаў да прыёму збожжа дырэктар канторы Заготзярно Вышынскі зняты з работы.

* * *

У тым-жа номеры была надрукавана заметка: „Наладзіць работу дома соцкультуры", дзе указвалася аб дрэннай рабоце загадчыцы клуба Палевіковай, а таксама адзначалася, што насельніцтва мала абслугоўваецца кіно.

Выканком Райсовета дэпутатаў працоўных паведаміў, што факты поўнасцю падцвердзіліся. Кіраўніцтва клуба заменена. Прыняты меры па наладжванню работы кінопераcоўкі.

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14861 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Савецкая вуліца, дом № 2.